УДК 93/94 (323)

# МІХАЛ КЛЕАФАС АГІНСКІ НА АПОШНІМ СЕЙМЕ РЭЧЫ ПАСПАЛІТАЙ У ГРОДНА

***Дзмітрый Станкевіч***
*Гродна, Беларусь*

У артыкуле апісваецца дзейнасць аўтара знакамітага паланэза на сейме па другому падзелу Рэчы Паспалітай. Выказваецца яго роль у гэтым палітычным працэсе, ягоныя погляды і галоўнае як ён успрымаў лёсавырашальную падзею для краіны і ў кантэксце лёс Вялікага Княства Літоўскага.

***Ключавыя словы: Міхал Клеафас Агінскі, сейм, Вялікае Княства Літоўскае (ВКЛ), Рэч Паспалітая***

Палітычная дзейнасць М.К. Агінскага вызывае на сённяшні момант у гісторыкаў шмат пытанняў. Пры тым што ягоная дзейнасць звязана ў большасці як палітыка "кампрамісаў" паміж "асабістым" і "дзяржаўным".З недаверам ставяцца да яго паплечнікі, абвінавацiўшы подпісам у трактаце аб другім падзеле Рэчы Паспалітай. Пры гэтым яго ставяць як адна з марыянетак расійскага ўрада. Тым больш узнікае наступнае пытанне чаму Агінскі, як адзін з прыхільнікаў рэформ, канстытуцыі сваім подпісам паставіў "крыж" на вышэйназванным дакуменце.

Як прадбачлівы палітык М.К. Агінскі разумеў, што Канстытуцыя 3 мая не зможа доўга праіснаваць і ўмяшання моцнага суседа не прадухіліць. Таму ён дзейнічаў хутка і пры гэтым дыстанцыраваўся ад абодвух варагуючых бакоў у вайне 1792 г.(інтэрвенцыя Расіі ў Рэч Паспалітую). Яго крокі можна ацаніць як дзеянне ў форс-мажорнай сітуацыі. З аднага боку, М.К. Агінскі згадзіўся на ўмовы, выстаўленыя яму ўрадавым Пецярбургам, тым самым паказаўшы сябе палітыкам, якім можна маніпуляваць. У прынцыпе ён і сам гэта разумеў, але не адышоў ад спраў (ён мог пагадзіцца на апеку над родзічам), а прыняў дзяржаўную пасаду, паставіўшы мэту – абараняць інтарэсы ВКЛ. Менавіта тут палітыка «кампрамісаў» сыграла яму на руку.

23 студзеня 1793 г. паміж Прусіяй і Расійскай імперыяй была падпісана пагадненне аб падзеле тэрыторыі Рэчы Паспалітай. Яго галоўным апраўданнем было жаданне не дапусціць распаўсюджвання «якабінскай заразы», якая, па меркаванню абодвух бакоў, прывяла да Чатырохгадовага сейму і Канстытуцыі 3 мая, натхнёнай рэвалюцыйнымі ідэямі Францыі. Сейм у Гродне павінен быў юрыдычна замацаваць дамову аб другім падзеле і разам з тым адмяніць усе рашэнні Вялікага сейма [2, с. 243].

Служба ва ўрадзе ВКЛ абавязвала прысутнасць на гэтым сейме М.К. Агінскага, намінаванага 7 мая 1793 г. па волі Кацярыны II і жаданню расійскага пасла на пасаду падскарбія ВКЛ. Цяпер перад ім паўстала задача павелічэння дзяржаўнай казны, амаль што пустой на той час.

У чэрвені М.К. Агінскі падаў на разгляд сейма праект новай формы кіравання краінай. У выступленні 17 чэрвеня 1793 г. ён заклікаў стварыць новую канстытуцыю,

кампрамісную для ўсіх бакоў. Але пасол Расійскай імперыі Якаў Сіверс не жадаў, каб увагу сейма адхілялі ад галоўнай мэты яго склікання, і прыстрашыў накладаннем секвестру на маёнткі падскарбія. Разумеючы безвыніковасць сваіх намаганняў, М.К. Агінскі ад’ехаў з Гродна, «каб паправіць сваё здароўе па хваробе страўніка ў Сокалаве». Зразумела, займаючы міністэрскую пасаду, ён не хацеў браць на сябе адказнасць за развал дзяржавы [1, с. 584]. Але па патрабаванню расійскага пасла, які прыгразіў секвестрам маёнтка, ліцвінскі палітык вымушаны быў вярнуцца на сейм у Гродна.

Літоўская даследчыца Р. Шмігельскіце-Стукене, спасылаючыся на мемуары аднаго з удзельнікаў сейма Антонія Трэмбіцкага, даказвае, што падскарбій займаўся на сейме не толькі вырашэннем фінансавых пытанняў, але і палітычнымі справамі. Ён далучыўся да так званай «прыдворнай групоўкі», якая займалася праблемай ратавання дзяржавы, пра што, аднак, ліцвінскі палітык нідзе не згадвае, і праводзіў на сейме яе, а не асабістыя ідэі [5, с. 251]. У жніўні гэта групоўка разам з М.К. Агінскім, нягледзячы на пагрозы Я. Сіверса, распрацавала праект рэформ дзяржаўнага кіравання.

4 верасня падскарбій паўторна падаў сейму праект рэформ, за які той становўча прагаласаваў 6 верасня, тым самым даўшы згоду на стварэнне дэпутацыі па падрыхтоўцы рэформы кіравання дзяржавай з 20 сяброў (разам з М.К. Агінскім) і віленскім біскупам І.Я. Масальскім на чале. Малады магнат прапускаў сеймавыя пасяджэнні, звязаныя з ратыфікацыяй руска-прускага пагаднення, але быў актыўным узельнікам абмеркавання пытанняў работы гэтай дэпутацыі.

Галоўнай мэтай дэпутацыі было стварэнне новай формы кіравання дзяржавай, якую трэба было выратаваць і падрыхтаваць для існавання ў новых умовах. У яе функцыі ўваходзіла 1) узмацніць паўнамоцтвы выканаўчай улады, склікаючы сейм раз у чатыры гады; 2) упарадкаваць адміністрацыю і фінансы краіны; 3) захаваць як мага больш рэформаў, прынятых на Чатырохгадовым сейме [5, с. 257]. Не абышлося без непаразуменняў і супярэчнасцей паміж каронными прадстаўнікамі дэпутацыі і ліцвінскімі, якія імкнуліся ўзаконіць дзяржаўны дуалізм Рэчы Паспалітай [5, с. 258].

Як прадстаўнік каралеўскай групоўкі М.К. Агінскі таксама прымаў удзел у вырашэнні пытання аб роспуску Таргавіцкай канфедэрацыі. Улада ў канфедэрацыі належала тады гетману С. Касакоўскаму, які ў свой час варожа ставіўся да ліцвінскай шляхты. Але гетман не атрымаў значнай падтрымкі з боку Расіі, для якой канфедрацыя была палітычнай зброяй вырашэння адносін паміж Пецярбургам і Берлінам і вызначэння ўнутранай і знешняй палітыкі Варшавы. Я. Сіверс разглядаў гэту канфедэрацыю як «запасны план» у выпадку ўзнікнення на сейме супраціву ратыфікацыі дагавора аб другім падзеле Рэчы Паспалітай. Як адзначае Р. Шмігельскіте-Стукене, яшчэ Станіслаў Аўгуст Панятоўскі бачыў у канфедэрацыі 1792–1793 гг. пагрозу дзяржаўнага хаоса і двоеўладдзя [8, С. 244–260]. М.К. Агінскі ў мемуарах паказаў сваю значную ролю ў вызначэнні лёсу Таргавіцы – менавіта ён расійскаму паслу паказаў «незлічоныя злачынствы, якія ўчыніла гэта канфедэрацыя» [1, с. 608]. Тым больш кіруючыся асабістай помстай за секвестр маёнткаў у 1792 г., М.К. Агінскі ўвайшоў у склад камісіі, створанай сеймам для разгляду скаргаў на дзейнасць Таргавіцкай канфедэрацыі [5, с. 259]. 15 верасня 1793 г. канфедэрацыя была распушчана, замест стварылі новую – канфедэрацыю Гродзенскага сейма.

Як падскарбія М.К. Агінскага не менш турбавалі пытанні паляпшэння эканамічнага і фінансавага становішча ВКЛ. Дэпутацыя па фарміраванню дзяржаўнага бюджэту, у падрыхтоўку якога ён унёс вялікі ўклад, пачала працу 30 жніўня. Яе першаступеннай задачай быў збор інфармацыі аб рэальнай сітуацыі ў сферы дзяржаўных фінансаў, потым – стварэнне фонда па вяртанню пазык Рэчы Паспалітай. Няпростай была праблема складання бюджэту – ВКЛ страціла эканамічна выгадныя рэгіёны, новы адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел ускладніў паступленне даходаў у скарб Кароны і Княства. Узнікала дыскусія наконт размеркавання паміж імі сродкаў, таму вырашалі скараціць заробак удзельнікам Пастаяннай Рады найвышэйшага рангу, а яе маршалку і 18

ПолесГУ

дарадцам – на 25%. На чвэрць была зменшана квота на працы па будаўніцтву Мухавецкага канала, нягледзячы на тое, што гэта быў адзін з самых важных праектаў.

Вялікую ўвагу падскарбій ВКЛ надаваў закону аб абмежаванні раскошы. У выступленні 9 лістапада 1793 г. ён падкрэсліваў значнасць для ўсіх саслоўяў гэтага закона, бо ён дапамог бы не толькіпазбегнуць унутраных сацыяльных супярэчнасцей, але і павысіць міжнародны прэстыж Рэчы Паспалітай: «…Няхай багацей знойдзе ў законе крэс сваім уяўным патрэбам, якія выклікаюць зайздрасць да яго стану … няхай маламёмны сілай закона будзе абаронены, каб звышмеры прыбыткаў сваіх не жыў … Людскасць займе месца ўяўных лішкаў, а дастатак не будзе жабраку вочы мазаліць» [6].

У той жа дзень на сейме быў зачытаны сам праект закона «Аб абмежаванні раскошы». У ім гаварылася: «… дзеля таго, каб запабегчы ўнутранаму збядненню, якое, як бачыцца, ёй (г. зн. Рэчы Паспалітай) пагражае, да таго ж узяўшы пад увагу перапынак у грашовым звароце, недахоп наяўных грошай і разарэнне банкіраў, якія нас пераконваюць, што гандлёвы баланс – відавочна супраць нас … каб запабегчы далейшаму руйнаванню краіны і з мэтай увядзенне ў дзеянне закона пра раскошу пастанаўляем … ніхто, не важна якога стану, полу і саслоўя, не зможа насіць і ўжываць багатых матэрый, тканых золатам або срэбрам, пад пагрозай штрафу 2000 злотых, за выключэннем паясоў, і толькі выраблених у нашых дзяржавах …» [7].

З улікам абвінавачванняў польскіх і ліцвінскіх палітыкаў у прасякнутасці французскім рэвалюцыйным ідэям у законе гаварылася пра ўвядзенне санкцый супраць французскага знешняга рынку: « … Паколькі дарагавізна французскіх тавараў, а таксама як і палітычныя меркаванні, указваюць нам на неабходнасць разрыву ўсялякай сувязі з нацыяй, паглыбленай у бязладдзе і апанаванай шкоднымі для грамадства крайнасцямі, то па гэтых дзвюх прычынах забараняем з 1 лютага 1794 года ўвоз усялякіх французскіх тавараў» [7]. Праект «Аб абмежаванні раскошы» быў разгледжаны на сейме, але яго прыняцце перанеслі на больш позні час.

Нягледзячы на патрыятычныя парывы і пазбяганне сеймавых пасяджэнняў, на якіх вырашаліся пытанні тэрытарыяльнага падзелу яго радзімы, падскарбій паставіў свой подпіс пад дакументам «Трактат между ея величеством императрицею всероссийскою, с одной стороны, и его величеством королем и яснейшею Речью Посполитою польскими, с другой, заключенный и подписанный в Гродне июля 11/22 дня 1793 года» [4].

Нягледзячы на пратэсты сеймавай апазіцыі 25 верасня 1793 г. была заключана дамова з Прусіяй, а 16 кастрычніка – з Расіяй аб перадачы тэрыторый і заключэнні саюзнай дамовы.

З Гродзенскага сейма М.К. Агінскі накіраваўся ў свой маёнтак Сакалоў. Туды да яго завітаў і кароль Станіслаў Панятоўскі, каб развеяць душэўны смутак, адпачыць ад перажыванняў і стомленасці, пагаварыць адзін на адзін з блізкім па духу, культуры і інтэлектам чалавекам [3, с. 107; 1, с. 615]. Кароль з непакоем гаварыў пра ўдзельнікаў Чатырохгадовага сейма, пра шчаслівыя гады дзеяння Канстытуцыі 3 мая і выказаў падазрэнне аб магчымасці паўстання, паймённа назваў тых, хто яго рыхтаваў (імя Т. Касцюшкі не было названа). Літоўскі падскарбій, як можна меркаваць па яго мемуарах, меў намер пакінуць краіну і таксама далучыцца да падрыхтоўкі вызваленчага паўстання.

Такім чынам, з аднаго боку, сітуацыя, у якой апынуўся М.К. Агінскі, зрабіла яго здраднікам сваёй дзяржавы. Пра гэта сведчаць тыя дакументы, дзе ён як дзяржаўная асоба ставіць свой подпіс.

Але дзённікі Гродзенскага сейма, дзе ўпаміналіся праекты і прамовы падскарбія па пытанню паляпшэння становішча Рэчы Паспалітай пасля другога падзелу, якія ён сам замоўчвае ў сваіх нататках, дазваляюць меркаваць аб патрыятычнай настроенасці магната. Значыць, прымаючы ўнутры- і знешнепалітычныя рэаліі, М.К. Агінскі быў вымушаны пайсці на паваду ў расійскага і прускага паслоў, але, лавіруючы паміж імі і прыхільнікамі караля, ён не страціў ліцвінскага патрыятызма і не папсаваў уласнай рэпутацыі. Так графу ўдалося ўвайсці ў яшчэ адзін палітычны кампраміс, але падзеі 1794



Полесгу

г. у Рэчы Паспалітай адхілілі яго ад шляху пошукаў кампрамісаў і пацвердзілі патрыятычную лінію думак.


1. Агінскі, М. К. Мемуары пра Польшчу і палякаў з 1788 да 1794 года / М.К. Агінскі // ARCHE Пачатак 2011. – № 6. – С. 463–722.
2. Гісторыя Беларусі : у 6 т. / рэдкал.: М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск: Экаперспектыва, 2000–2005. – Т. 3: Беларусь у часы Рэчы Паспалітай (XVII–XVIII стст.) / Ю. Бохан [і інш.]. – 2004. – 343 с.
3. Несцярчук, Л. М. Міхал Клеафас Агінскі: Ліцвін, Патрыёт, Творца / Л. Несцярчук. – Брэст : Брэсцкая друкарня, 2015. – 355 с.
4. Трактат между ея величеством императрицею всероссийскою с одной стороны и его величеством королем и яснейшею Речью Посполитою польскими с другой, заключенный и подписанный в Гродне июля 11/22 дня 1793 года // Восточная литература. Средневековые исторические источники востока и запада [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.vostlit.info/Texts/Dokumenty/Polen/XVIII/1. – Дата доступа: 10.01.2017.
5. Шмігельскіце-Стукене, Р. Нарысы палітычнай і дыпламатычнай дзейнасці Міхала Клеафаса Агінскага (ад Варшаўскага сойма 1786 г. да Гарадзенскага 1793 г.) / Р. Шмігельскіце-Стукене // ARCHE Пачатак. – 2014. – № 6. – С. 229–266.
6. Dnia 9. 9bra 1793 Projekt JW. Ogińskiego Podskarbiego W.W.X.Lit. Względem Prawa Zbytkowego // Sejm grodzieński 1793 [Zasób elektroniczny]. – Tryb dostępu: http://www.wbc.poznan.pl/dlibra/docmetadata?id=92193&from=&dirids=1&ver_id=&lp=3&QI=. – Data dostępu: 14.04.2017.
7. Głos Jasnie Wielmoznego Jmć Pana Michała Oginskiego, Woiewodzica i Posła Trockiego jako Delegowanego do Examinowania Kom: Skar: Koron: w Izbie Senatorskiey Dnia 24. Października 1786. Miany // Wielkopolska biblioteka cyfrowa [Zasób elektroniczny]. – Tryb dostępu: http://www.bkpan.poznan.pl%2Fbiblioteka%2FELITY%2FSEJM1793%2Fp186.htm%23xprojekt186. – Data dostępu: 13.02. 2017.
8. Šmigelskytė-Stukienė, R. Lietuvos Didžiosios Kunigaikštystės konfederacijos susidarymas ir veikla 1792–1793 metais / R. Šmigelskytė-Stukienė. – Vilnius : Liet. ist. inst., 2003. – 429 s.


ПолесГУ